# «БЕЛАРУСІЯ Ў ЛЮБОВІ ПАКЛЯНУСЯ»

*Сцэнарый літаратурна-музычнай вечарыны*

Гучыць запіс цесні «Спадчына» (верш Я. Купалы, музыка І. Лучанка). Па абодвух баках сцэны —- малюнкі беларускай прыроды. Калі рассоўваецца заслона, гледачы бачаць рэпрадукцыю з карціны Петры Сергіевіча «А хто там ідзе?», павялічаную праз эпідыяскоп, і напісаны прыгожымі літарамі эпіграф да вечарыны: «Людзьмі звацца».

Хочацца прапанаваць наступную інсцэніроўку верша ЯнкіКупалы «Ахтотамідзё?» -

У правым кутку сцэны стаіць група вучняў. Яны апра-нуты ў сялянскую вопратку, на нагах — лапці. Калі на сцэ-ну выходзяць вядучыя, вучні робяць два крокі наперад.

Першы вядучы. Ахтотамідзе? Другі вядучы.

Ахтотамідзе?

Першы і другі вядучыя *(разам).* Уагромністай та-койграмадзе?

Грамада. Беларусы.

Першы вядучы. А што яны нясуць на худых плячах? Другі вядучы; На руках у крыві, Першы і другі вядучыя *(разам).* Нанагахулапцях? Грамада *(робячы крок наперад).* Сваюкрыўду. Першы вядучы. А куды ж нясуць гэту крыўду ўсю? Другі вядучы. А куды ж нясуць напаказ сваю? : Грамада *(робячы другі крок наперад, сурова).* На свет цэлы.

Першы вядучы *(пытаеццабольш настойліва). Ахто* гэтаіх, не адзін мільён...

Другі вядучы, Крыўду несць наўчыў,

Першы і другі вядучыя *(разам).* Разбудзіў іх сон?

Грамада *(робячы яшчэ крок, бліжэй да вядучых, цвёр-да).* Бяда, гора.

Першы вядучы *(здзіўлена). А* чаго ж, чаго захаце-ласьім... ^

Другі вядучы. Пагарджанымвек,ім,сляпым,тлухім? Грамада *(з пачуццём чалавечай годнасці).* Людзьмі звацца!

*(Грамада разыходзіцца, кожны займае сваё месца: Паэт — за сталом, на якім тоўстая кніга і чарнільніца з гусіным пяром; Юнак спыняецца пасярод сцэны; Бела-. русачка надзявае на галаву вянок і адыходзіць у глыб сцэ-ны; некаторыя прысаджваюцца на краі сцэны, прыхіля-юцца да сцяны ці падыходзяць да юнака.)*

Юнак.

Многа народы цярпелі прымусаў:

жыць не давалі няволя і здзек, Горшае ж долі, апроч беларуса,

можа, не знаў ні адзін чалавек. Кожны народ сваю думку хоць смела

мовою роднай не ў сорам казаў, А беларуса ганьбоўна нямела —'

кожны мужычайяе называў... *Алесь Гурло. «Вольнае слова»*

Мужык. Пазнаюць людзей ці па гаворцы, ці па адзе-жы: ото ж гаворка, язык і ёсць адзежа душы... Беларусачка.

Сцвярджаюць гісторыкі і мовазнаўцы,
IПто паступова сціраюцца грані нацый.
І, нібыта як перажытак, аджыць павінна абавязкова
Мова маці маёй — беларуская мова.

*Рыгор Барадулін. «Мая мова»* Мужык. Братцы мілыя, дзеці зямлі-маткі маёй! Я сам калісь думаў, што мова нашая — « мужыцкая» мова і толь-кі таго. Але, паздароў Божа добрых людцаў, зтой пары я шмат дзе быў, шмат чаго відзеў ічытаў іпераканаў-ся, што мова нашая ёсць такая ж людская іпанская, як і французская альбо і іншая якая...

Першы вядучы. А можа, сапраўды наша мова такая, што ёю нічога добрага ні сказаць, ні напісаць не можна?

Мужык. Ой, не! Наша мова для нас святая... І гаворым жа мы на ёй шмат і добрага... *(Словы мужыка пададзены паводле прадмоў Францішка Багушэвічйі)*

Беларусачка.

У любімай мове роднай, наскай, Ах, якія словы: «Калі
ласка!..» Як звіняць яны сардэчнаю струною, Праз усё
жыццё ідуць са мною. Трапіць госць у будзень, а ці ў сйята:
Калі ласка, калі ласка ў хату!

Другі вядучы.

Не паспелі сесці пры сустрэчы,
Як патэльня засквірчэла ў печы,
Ды і чарка блíснула дарэчы.
Бульба, смажаніна і каўбаска,
Пакаштуйце, людцы, калі ласка! Першы вядучы.
Хлопец кажа дарагой дзяўчыне: Юнак.
Калі ласка! Будзеш гаспадыняй.
Эх, жыццё збудуем мы прыгожа.
Ўсе з табой нягрды пераможам^

*Пятрусь Броўка. «Калі ласка»*

Моўчкі ўскінула вочы. І замёр я на міг. Сумны позірк дзявочы у душу мне пранік. Як завуць і адкуль ты, дзе твой родны парог — Нерашучасцю скуты, я спытацца не змог.

*Ніл Гілевіч. «Моўчкі ўскінула вочы...»* Беларусачка.

Ая — дзяўчына з Беларусі, 3 калыскі мятава-духмянай,
Адтуль, дзе кола круціць бусел, Дзе кожны — госць, даўно

чаканы.

3 лугоў я, з каласкоў пшанічных, 3 азёраў сініх, ільняных,
Я—; з песень, ад душы лірычных, Дзядоў і прадзедаў маіх.

Я з Мрайкі— мілай летуцеякі, 3 Мсціжанскіх берагоў утульных, 3 тваіх далоняў немаленькіх, 3 ласкавых, чулых рук матуліных.

*Вера руланда. «Ая — дзяўчына з Беларусі»*

Юнак *{спявае песню Юрыя Семянякі на слоеы Алеся Ставера «Беларусачка», гл. с. 203).* Паэт.

Пад казачным дубам,
Над Нёманам сінім
Хлапец прызнаваўся ў каханні дзяўчыне.
І рэхам той шэпт адгукаўся між гаю: Юнак *(прыклаўшы далоні да вуснаў).*
4 Кахаю-у-у, кахаю-у-у-у... Беларусачка.

Я чула пяшчотнае, Шчырасці поўнае,'

Маё, беларускае, роднае, кроўнае,
Такое раптоўнае, такое чароўнае,
Такое ласкавае, цёплае, чыстае,
Як сонца, агністае,
Як Нёман, празрыстае,
Як казка, быліна,
Як песня, жаданае,
Дагэтуль зусім у жыцці непазнанае,
Вясновае слова ад шчырага сэрца.

Першы вядучы.

Яно празвінела над хвалямі
Ўрэчцы.
Вятрыска шаптаў яго з лісцем між гаю:
Кахаю, кахаю...
Шапталі яго сенажаць і дуброва,
Людзьмі перачутае,
Некаму нова, адзінае, дзіўнае,
Светлае слова —

Юнак і Беларусачка *(разам).*

Кахаю... кахаю...
;' Беларускаму краю
Бясконца мы слова «люблю» паўтараем!

*Данупга Бічэль-Загнетаеа. «Роднае слова»*

Хор *{выконвае песню Міколы Равенскага на словы КанстанцыіБуйло «Люблю наш край»).*

Люблю наш край, старонку гэту,
Дзе я радзілася, расла. Дзе першы раз пазнала шчасце,
Слязу нядолі праліла. Люблю народ наш беларускі
І хаты ў зелені садоў, Залочаныя збожжам нівы,
Шум нашых гаяў і лясоў. І жніва час душой люблю я,
І першы звон сярпоў і кос,Калі на поле выйдуць жнеі,
А касары на сенакос. І песню родную люблю я,
Што ў полі жнеі запяюць, Як гукі звонкія над нівай
Пераліваюцца, плывуць. Люблю ў пагодную я ночку
Да позна ў садзіку сядзець, Сачыць за ясных зор мігценнем,
На месяц залаты глядзець.

Паэт. Мала на зямлі беларусаў, якія б не ведалі, не чулі гэтай песні.

Мужык. Спяваюць яе ў кожнай беларускай вёсцы. Яна — нібы гімн для нашых землякоў на Беласточчыне і ў Злучаных Штатах Амерыкі.

Паэт. Яе спяваюць беларусы ў Аргенціне і Парагваі, бо ў кожным яе радку гучыць прызнанне ў любові да любай і адзінай Бацькаўшчыны.

Мужык. Песню называюць народнай, забываючыся, што 90 гадоў таму ёй дала жыццё непаўторная Канстандыя Буйла.

Беларусачка. Верш «Люблю...» ў пачатку 1920-х га-доў паклаў на музыку выдатны беларускі кампазітар Мі-кола Равенскі.

*(Хор паўтарае першыярадкі песні «Люблю наш край».)* Паэт.

Люблю ц'ябе' ў веснавых праталінах, У белай хустцы
маладых снягоў. Як на грыбы, багата ты на таленты —
Пільней глядзі і нерушы знаходзь.

*Рыгор Барадулін. «МаяБацькаўшчына»*

Юнак.

Мой край зверабою, рамонкаў і мяты, Мой край — васільковы,
рабінавы край. 3 далёкай даўніны на песні багаты, На соль і на
хлеба цяжкі каравай.

Беларусачка.

На лён валакністы, на дзень прамяністы, Багаты гасціннасцю
нашых людзей. На сонечны ранак, ад росаў іскрысты, Крынічанькі
ж нашы — не знойдзеш чысцей!

*Вера Буланда. «Мойкрай>>*

Хор *(выконвае песню «Колькі ў небе зор», словы і музы-каАляксандра Шыдлоўскага).*

Колькі ў небе зор — цяжка палічыць, Толькі з іх адна
найярчэй гарыць. Гэта ты мая, зорка ясная. Ты — любоў

мая, непагасная.

Ў працы і ў жыцці добра нам з табой Марыць і любіць з песняй маладой. Сонца і вясна, навакол прастор. Шчасця болын у нас, як на небе зор.

Край шырокі наш, мірны, дарагі. Гбягуць удаль светлыя шляхі. , Мне з табой па іх хочацца ісці І дзяліць усё разам у жыцці.

Другі вядучы.

Дзе ж той край залатакосы,
край зядёны —
рыкласіны,
звон пчаліны,
моралёну?
Там, дзе Прыпяць і Ясельда,
дзе танцуюць пад цымбалы на вяселлях,
дзе жанчына, сінявокая і ласкавая,
звонка чаравічкамі паляскавала.

*Пімен Панчанка. «Край паэтаў»*

*(Танцавальная група выконвае шанец «Лявоніха». Усе ўдзельнікі выходзяць на сцэну.)*

Першы вядучы.
Дзе мой край? Паэт.
Там, дзе вечную песню пяе Белавежа,
Там, дзе Нёман на захадзе помніць варожую кроў,
Дзе на ўзвышшах наваградскіх дрэмлюць суровыя вежы
І вішнёвыя хаты глядзяцца ў шырокі Дняпро.
Мужык.
Ты ляжыш там, дзе сіняя Прыпяць ласкава віецца, Дзе Сафія плыве над Дзвіною, нібы карабель... Там, дзе сэрца маё з першым крокам, як молат, заб'ецца, Калі б нават сляпым і глухім я прыйшоў да цябе. Юнак *(падхопліваючы).*
Што сляпым? Нават мёртвым успомню высокія зоры,
Над ракою чырвонай і цьмянай палет кажаноў,
Белы ветразь на сініх, на гордых, як мора, азёрах,
І бары-акіяны, і неба — разлівы ільноў.
Другі вядучы.
Дзе мой край?
Беларусачка.
Там, дзе людзі ніколі не будуць рабамі,
Што за поліўку носяць ярмо ў безнадзейнай турме,
Дзе асілкі-хлапцы маладымі ўзрастаюць дубамі,,
А мужчыны, як скалы — ударыш, і зломіцца меч.

Паэт.
Дзе мой край?
Першы вядучы.
Там, дзе мудрыя продкі у хвоях паснулі,
Дзе жанчыны, як радасны сон у стагах на зары,
А дзяўчаты, як дождж залаты, а сівыя матулі,
Як жніўё з павуціннем і добрае сонца ўгары.
Там звіняць неўміручыя песні на поўныя грудзі,
Там спрадвеку гучыць мая мова, булатны клінок.
Тая гордая мова, якую й тады не забудзем,
Калі сонца з зямлёю ў апошні заглыбяцца змрок.
Другі вядучы.
Ты — напі край.
Ты — чырвоная груша над дзедаўскім домам, Лістападаўскіх знічак густых фасфарычная рацць, Ты — наш сцяг, што нікому, нікому на свеце, нікому Не дамо абсмяяць, апаганіць, забыць ці мячом зваяваць.
Мужык.
Мы клянёмся табе баразной сваёй першай на полі І апошняй раллёй, на якую ўпадзём у журбе.
Усе *(разам).*
Мы клянёмся табе, што ніколі,
Ніколі,
Ніколі,
Так, -
Ніколі не кінем,
Не кінем,.
Не кінем цябе.
*Уладзімір Караткевіч. «Беларуская песня»*